Блізкая ўлада

Ацяпленне ад электрычнасці

Пытанне электрыфікацыі жыллёвага фонду хвалявала жыхароў Віцебшчыны падчас прамой тэлефоннай лініі і прыёму грамадзян, што правёў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ.

Фота БелТА.

Магчымасцю агучыць сваё пытанне скарысталіся заяўнікі з Лёзненскага, Глыбоцкага, Сенненскага, Полацкага раёнаў, а таксама жыхары абласнога цэнтра. У прыватнасці, значная колькасць зваротаў датычылася магчымасці ацяплення жылых дамоў з дапамогай электракатлоў.

— Чым бліжэй увод у эксплуатацыю БелАЭ, тым больш насельніцтва разумее перспектывы, якія адкрываюцца з уводам гэтага аб'екта, — растлумачыў актуальнасць агучанай тэмы Анатоль Ліневіч.

Пакуль жа асноўнай перашкодай у вырашэнні шматлікіх зваротаў выступае недастатковая магутнасць ЛЭП. Напрыклад, у Лёзненскім раёне, з гэтай прычыны больш за сто заяўнікаў атрымалі адмову — гэта палова ад усіх, хто звярнуўся з заявай па ўстаноўцы электракатлоў у мясцовы філіял «Віцебскэнерга».

На думку памочніка Прэзідэнта, неабходна сфарміраваць у раёнах спісы тых, хто жадае гэта зрабіць. Гэта паўплывае на фарміраванне адпаведнай дзяржаўнай праграмы.

— Трэба таксама выпрацаваць нарматыўны дакумент з адзіным падыходам, згодна з якім можна будзе дзейнічаць далей, — лічыць ён.

Таксама да Анатоля Ліневіча звярнуўся дырэктар прыватнага прадпрыемства з Гомеля, які прасіў пасадзейнічаць у рэалізацыі бізнес-праекта. У прыватнасці, мужчына плануе ствараць вытворчасць па зборы і перапрацоўцы выкарыстаных масленых фільтраў на тэрыторыі Аршанскага раёна, скарыстаўшыся прэферэнцыямі, што дае Указ № 506. Бізнесмен распрацаваў бізнес-план, зарэгістраваў прадпрыемства на аршанскай пляцоўцы СЭЗ «Віцебск», але далей рэалізацыя праекта не ідзе з-за немагчымасці вызначэння крытэрыяў яго эфектыўнасці.

Акрамя таго, да памочніка Прэзідэнта звярнуліся тры шматдзетныя сям'і з Полацка і Віцебска, якія агучылі асабістыя пытанні, звязаныя з уладкаваннем дзяцей на аздараўленне ў санаторый, паляпшэннем жыллёвых умоў і выкарыстаннем сямейнага капіталу.

Усе звароты, якія былі агучаны, Анатоль Ліневіч узяў на асабісты кантроль. Дзе гэта магчыма, будзе аказана дапамога і прыняты адпаведныя меры. У гутарцы з журналістамі памочнік Прэзідэнта звярнуў увагу на эфектыўнасць такой формы работы з людзьмі.

Паводле БелТА.

Добраўпарадкаванне — на першым месцы

З 21 звароту, якія паступілі на прамую лінію да памочніка Прэзідэнта — інспектара па Брэсцкай вобласці Анатоля МАРКЕВІЧА, большасць датычылася добраўпарадкавання. Людзі прасілі пасадзейнічаць у рамонце даху над старым домам, паправіць дарогу на пад'ездзе да садовага таварыства, скардзіліся на недастатковую прыборку дворовых тэрыторый.

Фота БелТА.

Жанчына, якая жыве ў Паўднёвым мікрараёне Брэста, узняла праблему добраўпарадкавання помніка ваенным падзеям. Паўднёвы — былы ваенны гарадок. Тут многа мясцін, звязаных у тым ліку і з ваеннымі падзеямі. У скверы ў самым цэнтры былога гарадка, а цяпер мікрараёна стаіць абеліск на месцы пахавання 38 вайскоўцаў, якія загінулі ў ліпені 44-га пры вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Паводле слоў заяўніцы, пляцоўка вакол помніка даўно прыйшла ў заняпад, асфальт пакарабаціўся, утварыліся яміны, адным словам, памятнае месца выглядае занядбана. Яна не адразу стала турбаваць памочніка кіраўніка дзяржавы, а звярталася ў гарвыканкам, адміністрацыю Маскоўскага раёна Брэста. Атрымала адказы, дзе гаворыцца, што ў горада ёсць планы па глабальным добраўпарадкаванні сквера з абавязковай мадэрнізацыяй пляцоўкі вакол абеліска. Побач будуць пракладзены пешаходныя дарожкі, зроблены малыя архітэктурныя формы, уладкаваная дзіцячая пляцоўка, нават прадугледжаны амфітэатр. Цяпер вядзецца пошук інвестара для правядзення названага плана ў жыццё. Але ж аўтар звароту не пагадзілася з такой пастаноўкай пытання. Яна лічыць, што спачатку трэба добраўпарадкаваць помнік, а потым можна шукаць інвестара і абнаўляць сквер цалкам.

Анатоль Маркевіч падтрымаў тэлефоннага абанента. Памочнік Прэзідэнта назваў гэты факт упушчэннем у комплексе работ па падтрыманні ў парадку памятных мясцін, звязаных з гісторыяй апошняй вайны. Паабяцаў у хуткім часе пабываць у Паўднёвым і мабілізаваць адказныя службы з тым, каб да 3 ліпеня пляцоўка перад помнікам выглядала належным чынам.

Паводле БелТА.

Прамыя тэлефонныя лініі з удзелам памочнікаў Прэзідэнта на гэтым тыдні працягнуцца. Так, заўтра, **11 чэрвеня, з 9 да 12 гадзін у Гомельскім аблвыканкаме** прымаць званкі **па тэлефоне (0232) 321237 будзе памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Вітольдавіч ШУЛЕЙКА. У Дзятлаўскім райвыканкаме ў гэты ж час** на прамой сувязі **па нумары (01563) 61251** будзе **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Іван Антонавіч ЛАЎРЫНОВІЧ.** А **ў пятніцу, 12 чэрвеня,** можна будзе **з 10 да 13 гадзін** патэлефанаваць **у Мінскі аблвыканкам па нумары (017) 5004160** — прымаць званкі ў гэты час будзе **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар Уладзіміравіч ЯЎСЕЕЎ.**

Аты-баты

ПРЫСЯГА Ў РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

Учора ў Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы адбыўся 64-ы выпуск выхаванцаў. Сёлета выпускную роту пакінулі 53 юнакі. Сярод іх — два лаўрэаты Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі і адзін залаты медаліст. Прамая трансляцыя мерапрыемства вялася на канале «Ваен ТБ» у Youtube.

Намеснік начальніка вучылішча Таццяна Кулеш паведаміла, што, аднак, паступаць у ваенныя навучальныя ўстановы будуць усяго толькі 48 чалавек.

Кіраўніцтва Міністэрства абароны прадстаўляў **намеснік міністра абароны Сяргей ПАТАПЕНКА.** Ён расказаў пра тое, што ваеннае ведамства вядзе велізарную работу датычна прафілактыкі распаўсюджвання каранавіруса.

— Захворэлыя ёсць, але, як правіла, інфекцыя працякае ў лёгкай форме, без сур'ёзных наступстваў, — заўважыў Сяргей Патапенка. — Так, праблема існуе, але будзем спадзявацца, што яна нас хутка пакіне.

Трэба нагадаць, што сто афіцэраў запасу, якія не праходзілі ваенную службу і не маюць права на адтэрміноўку, будуць сёлета прызваны ў войска — такая норма ўтрымліваецца ва Указе Прэзідэнта № 181, падпісаным 28 мая. Ці будуць яны праходзіць каранцінныя мерапрыемствы?

— Мы іх прызавём у розны час, не ўсіх адразу, — падкрэсліў Сяргей Патапенка. — Але да канца года гэта будзе здзейснена. Перад гэтым мы ўсіх іх праверым, ці няма ў іх каранавіруса.

Пры гэтым 13 чэрвеня ў войсках новае папаўненне будзе прымаць прысягу. Звычайна ў гэты дзень сотні і тысячы блізкіх і родных прыязджаюць паглядзець на сваіх дзяцей, якія са зброяй у руках прамаўляюць словы на вернасць Радзіме. Аднак сёлета ўсё будзе іначай.

— Усе навабранцы перад тым, як трапіць у часці, прайшлі праз двухтыднёвую ізаляцыю, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства абароны Наталля ГАЎРУСІК.** — Праз эпідэміялагічную сітуацыю мы не будзем сёлета запрашаць на прыняцце прысягі родных і блізкіх. Аднак увесь неабходны цырыманіял захаваецца. А з самых масавых месцаў прыняцця прысягі будзе наладжана анлайн-трансляцыя на канале «Ваен ТБ» у Youtube. Гэта 72-і гвардзейскі аб'яднаны вучэбны цэнтр падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў у Барысаве і 5-я асобная брыгада спецыяльнага прызначэння ў Мар'інай Горцы.

Такім чынам, бацькі змогуць назіраць за падзеямі ў рэжыме рэальнага часу з любога пункта Беларусі. Відэавіншаванні, дасланыя салдатам, пакажуць падчас урачыстых мерапрыемстваў пасля цырымоніі прыняцця прысягі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Прыёмная кампанія — 2020

З аграрнага класа ў ВНУ... без экзаменаў

Выпускнікам аграрных класаў і салдатам тэрміновай службы дадзены льготы пры паступленні.

Як паведаміла прэс-служба Міністэрства адукацыі, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 209, якім уносяцца змяненні ва Указ № 80 ад 7 лютага 2006 года «Аб правілах прыёму асоб для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені і сярэдняй спецыяльнай адукацыі».

Прынятыя змены дазволяць выпускнікам профільных аграрных класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі пры паступленні на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў залічвацца па выніках сумоўя без уступных выпрабаванняў пры захаванні пэўных патрабаванняў: наяўнасці ў атэстаце адзнак не ніжэй за 6 балаў па ўсіх вучэбных прадметах і адзнак не ніжэй за 7 балаў па адпаведных профільных прадметах.

У рамках профільнага навучання класы аграрнай накіраванасці вось ужо два гады функцыянуюць на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі. У 2019/2020 навучальным годзе ў іх навучаліся 77 420 чалавек.

Навучэнцы аграрных класаў вывучаюць на павышаным узроўні асобныя навучальныя прадметы (профільныя прадметы) і дадаткова асвойваюць змест вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў «Уводзіны ў аграрныя прафесіі», якую распрацавала Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

Залічэнне ў класы аграрнай накіраванасці ажыццяўляецца па конкурсе: сярэдні бал пасведчання аб агульнай базавай адукацыі павінен быць не ніжэй за 5 балаў, а адзнакі па профільных вучэбных прадметах не ніжэй за 6 балаў.

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання ініцыявала льготы выпускнікам класаў аграрнай накіраванасці пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю — па аналогіі з залічэннем выпускнікоў профільных педагагічных класаў на педагагічныя спецыяльнасці. Гэта прапанова знайшла падтрымку ў Міністэрства адукацыі.

Указам таксама даюцца прэферэнцыі для асоб, якія прайшлі тэрміновую ваенную службу (службу ў рэзерве), пры наяўнасці рэкамендацыі воінскіх часцей. Яны змогуць удзельнічаць у конкурсе на атрыманне адукацыі ў завочнай і вячэрняй формах за кошт бюджэтных сродкаў, а таксама паступаць па-за конкурсам (для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі) на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці. У ліку прэферэнцый для гэтай катэгорыі асоб таксама значыцца паступленне па-за конкурсам (для атрымання вышэйшай адукацыі) на спецыяльнасці профілю «Ахова здароўя» пры наяўнасці сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыі.

Акрамя таго, Міністэрству транспарту і камунікацый даручана вызначыць парадак прафесійнага адбору асоб для атрымання вышэйшай адукацыі па асобных спецыяльнасцях грамадзянскай авіяцыі. Падрыхтоўку такіх спецыялістаў плануецца распачаць з 2021 года на базе Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРЫРОДА ЎЗДЫХНУЛА З ПАЛЁГКАЙ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так, у кароткатэрміновай перспектыве мы бачым пэўныя пазітыўныя моманты, звязаныя са зніжэннем забруджвання ў выніку чалавечай дзейнасці. Але ёсць і трывожныя сігналы: людзі ў мэтах захавання ўласнай бяспекі пераселі з грамадскага транспарту на асабісты. Я думаю, зараз вельмі спрыяльны час для таго, каб стымуляваць праграмы па развіцці веларуху.

У шэрагу магазінаў з пачаткам пандэміі пачала расці колькасць аднаразовай тары і ўпакоўкі, прычым пашырэнне яе выкарыстання не заўсёды мае прамое дачыненне да пытанняў бяспекі, таму што, як нам вядома, вірус у першую чаргу распаўсюджваецца паветрана-кропельным шляхам. А заказы прадуктаў анлайн, колькасць якіх узрасла, суправаджаюцца пакетамі, поліэтыленавай тарай і нават пухірыстай плёнкай.

Але я застаюся аптымістам, таму што пакуль усе планы па скарачэнні выкарыстання аднаразовай упакоўкі і ў Беларусі, і ў свеце застаюцца ў сіле. Праўда, трэба пастаянна нагадваць, што, вырашаючы адну праблему, нельга забывацца пра іншыя.

З пачаткам пандэміі мы сталі выкарыстоўваць усё больш розных дэзынфектантаў, актыўных хімічных рэчываў, якія вырабляюцца ў вялікіх аб'ёмах, а затым трапляюць у сістэму каналізацыі (уплываюць на якасць ачысткі сцёкавых водаў) і ў навакольнае асяроддзе. Таксама сталі больш часу праводзіць у закрытых памяшканнях, дзе прысутнічае шмат хімічных рэчываў, якія ўтрымліваюцца ў шпалерах, фарбах, пластыку, аддзелачных матэрыялах. І усё гэта разам таксама ўплывае на наша здароўе.

Сітуацыя з распаўсюджваннем каранавіруса паказала важнасць для чалавека моцнага імунітэту, ад якога напрамую залежыць цяжкасць працякання захворвання ў выпадку сустрэчы арганізма з узбуджальнікам. Між іншым, ёсць шэраг эндакрынных разбуральнікаў — хімічных рэчываў, якія ўплываюць на наш імунітэт.

Фота Greenpeace.

Ветрапарк у Паўднёвай Карэі.

МЕДЫЦЫНСКІЯ АДХОДЫ: ШТО З ІМІ РАБІЦЬ?

— Калі ў нас раней «лёталі» ў паветры поліэтыленавыя пакеты, то зараз «лётаюць» яшчэ і аднаразовыя маскі, пальчаткі плюс вільготныя сурвэткі, — падзялілася сваімі назіраннямі **супрацоўніца праграмы па хімічных рэчывах і адходах Цэнтра экалагічных рашэнняў Наталля БЛЫШЧЫК.** — Пандэмія абвастрыла праблемныя моманты і паказала, куды трэба развівацца і што можна паляпшаць. Адходы палімераў ствараюць найбольшыя праблемы на палігонах, таму што яны не перапрацоўваюцца.

Па выніках 2019 года, колькасць смецця ў Мінску па агульнай масе зменшылася: калі раней гэта лічба складала 1 млн тон у год, то летась — 780 тысяч тон. Але пры гэтым палімерныя адходы і пластык усё роўна застаюцца на першым месцы па аб'ёмах, і яны не змяншаюцца — пластык мёртвым грузам кладзецца на нашы палігоны.

З пандэміяй у нас абвастрылася і праблема ўтылізацыі насельніцтвам медыцынскіх адходаў. Мы даўно кажам пра тое, што трэба арганізоўваць для людзей сістэму асобнага збору лекавых сродкаў і іншых медыцынскіх адходаў, але пакуль што нейкіх заўважных крокаў у гэтым плане не зроблена. З медыцынскіх адходаў можна здаць для далейшай утылізацыі толькі ртутныя тэрмометры. І толькі ў некалькіх гарадах у якасці пілотных праектаў арганізаваны пункты, куды можна прынесці лекі, непрыдатныя для далейшага выкарыстання. Мы праводзілі некалькі гадоў таму даследаванне, у ходзе якога высветлілася, што адходы лекаў атрымоўваюцца ў людзей пераважна з той прычыны, што фармацэўтычныя прэпараты набываюцца з запасам. Мяркую, што ў сітуацыі з распаўсюджваннем каранавіруса страх прымусіў людзей запасацца лекамі, таму праблема дадаткова абвастрыцца. Лічу, што фармацэўтычным вытворцам трэба больш працаваць у плане інфармавання насельніцтва наконт рацыянальнага выкарыстання лекаў, а таксама па праблеме мікробнай рэзістэнтнасці ў выніку неапраўданага спажывання антыбіётыкаў і, канешне, арганізоўваць пункты для збору лекаў.

Асобна трэба спыніцца на выкарыстанні масак, бахіл, медыцынскіх накідак, якія выпускаюцца з палімераў. Усе гэтыя сродкі індывідуальнай аховы выкарыстоўвацца ў апошнія месяцы ў вялікай колькасці (ва Ухані ў разгар эпідэміі медыцынскія адходы ў шпіталях выраслі ў шэсць разоў — з 40 да 240 тон у дзень. — **Аўт.**).

Тэхналогіі перапрацоўкі палімернага нятканага валакна ў свеце ёсць, але не ў нашай краіне. І гэта можа стаць пунктам для росту. Я гляджу, якія рэкамендацыі распаўсюджваюцца сярод насельніцтва: выкарыстаную маску, перш чым выкінуць у агульнае смецце, трэба змясціць у поліэтыленавы пакет. Такім чынам утвараецца дадатковае смецце, якое не перапрацоўваецца. Таму мы, эколагі, раім выкарыстоўваць для гэтых мэт папяровыя пакеты. Альтэрнатывай могуць стаць шматразовыя маскі, але ў такім выпадку трэба ўзяць на сябе адказнасць за іх правільнае выкарыстанне і далейшую дэзынфекцыю.

ЧАСОВАЯ ПЕРАДЫШКА

На думку **кандыдата геаграфічных навук, эксперта ў галіне кліматычнай палітыкі МГА «Экапраект» і EVRESCO (Ірландыя) Марыі ФАЛАЛЕЕВАЙ,** моцнага ўплыву на клімат пандэмія не акажа, таму што яго змяненне — маштабны працэс са мноствам фактараў, і некалькіх месяцаў каранціну недастаткова для таго, каб адбыліся радыкальныя змены.

Уся гэтая сітуацыя прадэманстравала, што скарачэнне выкідаў — гэта цяжка, складана, але цалкам магчыма.

— Колькасць шкодных выкідаў у атмасферу насамрэч зменшылася (у некаторых рэгіёнах Кітая — ад 25 да 45 працэнтаў), але гэта перадышка — часовая, — упэўнена заяўляе Марыя. — Калі мы кажам пры выкіды парніковых газаў, не трэба забываць, што яны маюць дастаткова працяглы «тэрмін жыцця» ў атмасферы. І канцэнтрацыя парніковых газаў у цэлым засталася там ранейшая — яе фарміруе не столькі штогадовы выкід, колькі ўвесь назапашаны за індустрыяльную эру аб'ём. Па першых ацэнках, пандэмія і эканамічны спад прывядуць да таго, што за год колькасць шкодных выкідаў у атмасферу можа зменшыцца на восем працэнтаў. Але гэта кропля ў моры. Нагадаю, што мэта Парыжскага пагаднення аб змяненні клімату — утрымаць рост глабальнай сярэдняй тэмпературы на ўзроўні ніжэй за два градусы ў параўнанні з даіндустрыяльнай эпохай і прыкласці намаганні, каб абмежаваць гэты рост велічынёй у 1,5 градуса. Але для яе дасягнення нам трэба да пачатку 2030-х гадоў зменшыць сусветныя выкіды вуглекіслага газу на 50 працэнтаў.

Змяненне клімату ўжо запушчана, таму змяншэнне выкідаў на восем працэнтаў ні на што істотна не паўплывае, тым больш мы ўжо бачым на прыкладзе таго ж Кітая: як толькі адмяняюцца каранцінныя мерапрыемствы, усё хутка вяртаецца на ранейшыя пазіцыі. Гарады зноў зацягнула смогам. Ёсць апасенні, што без сістэмных экалагічных рэформаў імкненне кітайскіх улад кампенсаваць страты за месяцы прастою зноў прывядзе да рэзкага росту забруджвання атмасферы. Але ўся гэтая сітуацыя прадэманстравала, што скарачэнне выкідаў — гэта цяжка, складана, але цалкам магчыма.

Хачу заўважыць, што пасля эканамічнага крызісу 2008 года ў свеце моцна ўпала цікавасць да тэмы экалогіі і клімату. Але некаторыя краіны, такія, напрыклад, як Паўднёвая Карэя, вельмі паспяхова выкарысталі гэту сітуацыю для пераходу на больш «зялёную эканоміку». Ёсць адчуванне, што мы з'яўляемся сведкамі новай гісторыі. Узнікалі сумненні: а што будзе далей з «зялёнай павесткай»? Еўрасаюз пацвердзіў, што Еўропа будзе і надалей прытрымлівацца «зялёнага курсу», а нядаўна прыняты план па аднаўленні эканомікі, і ён будзе абапірацца на прынцыпы зялёнага будаўніцтва.

Сітуацыя з пандэміяй высвеціла цікавую тэндэнцыю — тыя бізнесы і прадпрыемствы, у якіх былі больш сур'ёзныя экалагічныя праграмы і праграмы карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці, аказаліся больш устойлівымі да эканамічнага спаду. Гэту інфармацыю яшчэ трэба аналізаваць.

З ГОРАДА — НА ПРЫРОДУ

— Велізарную праблему ўяўляе сабой рост насельніцтва Зямлі. І калі яно будзе і далей расці тымі ж тэмпамі, то папярэдзіць шкоду прыродзе будзе проста немагчыма. Тэмпы зніжэння экасістэм і пэўных відаў флоры і фаўны проста жахлівыя, — падкрэсліве **дырэктар Грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ.** — Знікаюць трапічныя лясы, каралавыя рыфы. Да слова, падчас пандэміі і ўвядзенння строгіх каранцінных мер браканьеры скарысталіся гэтай сітуацыяй і не сядзелі дома... Еўрапейскія і амерыканскія партнёры скардзяцца на тое, што з-за каранціна прыродаахоўныя тэрыторыі, нацыянальныя паркі засталіся без наведвальнікаў, адпаведна не былі атрыманы даходы ад экатурызму, якія складаюць асноўную частку іх даходаў. А для Беларусі я асабіста бачу вялікі плюс у тым, што вясной да нас не прыехалі замежныя паляўнічыя і паляванне праходзіла, так бы мовіць, у дамашнім маштабе.

Увогуле некаторыя даследчыкі мяркуюць, што гэта наша ўмяшальніцтва ў дзікую прыроду, памяншэнне біяразнастайнасці і разбурэнне прыродных месцаў пражывання біялагічных відаў прыводзіць да выбухаў новых вірусаў. Патагены пераходзяць ад жывёл да чалавека і хутка распаўсюджваюцца. У тым ліку гэта звязана з рынкамі дзікіх жывёл у Афрыцы і Азіі — часта паўлегальных, якія працуюць без выканання санітарных нормаў. Некаторыя настойваюць на поўным іх закрыцці, аднак ёсць небяспека, што гэта прывядзе да рэзкага росту чорнага рынку. У Кітаі пасля пачатку эпідэміі каранавіруса забаронў на гандаль дзікімі жывёламі ўсё ж такі ўвялі. Але ў некаторых краінах, замест таго каб аднаўляць і аберагаць прыродныя экасістэмы, наадварот, людзі з-за страху пачалі знішчаць кажаноў.

Вера СЫСОЕВА, эксперт па зялёным горадабудаўніцтве (праект ПРААН «Зялёныя гарады») падзялілася сваім бачаннем, як будзе далей развівацца сітуацыя:

— Першы важны аспект, які датычыцца каранавіруса і яго ўплыву на нас, — гэта фармат рассялення. З аднаго боку, людзі па-ранейшаму сцякаюцца ў буйныя гарады, туды, дзе ёсць работа. А з другога — усё больш гараджан хочуць жыць па-за іх межамі. І ў гэтым я бачу некалькі праблем. Першая — іх штодзённыя не менш як саракахвілінныя паездкі ў горад на ўласных аўтамабілях у абодва бакі і адпаведна ўзрастанне нагрузкі на навакольнае асяроддзе. Калі катэджны пасёлак мае шчыльнасць засялення 30 чалавек на гектар (а гэта не класічны пасёлак, бо звычайна на гектар прыпадае 10—15 чалавек), усё роўна нават такая высокая шчыльнасць не дае падстаў для развіцця ў гэтай мясцовасці грамадскага транспарту, аховы здароўя і сацыяльных паслуг. Усё гэта становіцца неэфектыўным і вельмі рэсурсазатратным. Хтосьці лічыць, што горад, як цэнтр аказання паслуг, найлепшы фармат рассялення. А я прытрымліваюся той думкі, што менавіта шчыльна заселеныя гарады ў Кітаі найбольш паспяхова справіліся з кантролем за вірусам, дзякуючы згуртаванасці грамадзянскіх груп і правільнаму ўкараненню новых тэхналогій. Усе скааперыраваліся ў барацьбе з агульнай пагрозай.

Хацелася б звярнуць увагу і на спосабы перамяшчэння. Грамадскі транспарт апусцеў, але на вуліцы выехаў асабісты транспарт. Мяркую, што сёння самы час для стварэння альтэрнатыўных спосабаў. Ровар — той транспарт, які дазваляе сацыяльна дыстанцыявацца, але для арганізацыі веласіпеднага руху ў гарадах павінна быць створана адпаведная інфраструктура.

Яшчэ крыху назіраняў. Сацыяльная самаізаляцыя і пераход на аддаленую работу значна павысілі спажыванне энергарэсурсаў у жылым сектары, нагрузку на оптаваалкано і інтэрнэт. Існуючыя сеткі патрабуюць мадэрнізацыі, што вымагае сур'ёзных фінансавых укладанняў. Істотна вырасла і спажыванне вады. Калі мы мыем рукі не пяць, а дзесяць разоў у дзень, то адзін чалавек за суткі вылівае на 20—40 літраў вады больш. Таму на парадак дня выходзіць задача эканоміі водных рэсурсаў. Трэба думаць, як не траціць артэзіянскую ваду на туалет ці мыццё, а гэта робіць актуальным выкарыстанне новых тэхналогій па зборы дажджавой вады, па другасным выкарыстанні бытавой вады. Такія рашэнні — дарагія і патрабуюць дадатковых выдаткаў на праектаванне і рэалізацыю.

Мы гатовыя ўкараняць найлепшыя практыкі, але расстаноўка прыярытэтаў і вызначэнне мэт — задача не горадабудаўнікоў і архітэктараў, а грамадства і органаў кіравання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НЕБЯСПЕКА ЗАРАЗІЦЦА ЗАХОЎВАЕЦЦА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Чакаць, што такое цёплае надвор'е само па сабе прывядзе да рэзкага зніжэння захваральнасці, не выпадае, — расказала ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» **намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ.** — Таму многае залежыць ад таго, наколькі мы самі, кожны чалавек паасобку, будзем прытрымлівацца тых мер, якія рэкамендаваны раней.

Яна заклікала насіць маскі ў грамадскім транспарце, магазінах і іншых месцах масавага збору людзей.

«Калі ў масцы няма патрэбы,
яе варта зняць і пакласці ў пакет.
Ні ў якім разе не трэба насіць яе на вуху
ці падбародку — такім чынам
вы спачатку інфіцыруеце маску,
а потым і сябе».

Звярнула ўвагу на тое, што насельніцтва апошнім часам стала грэбаваць мерамі бяспекі, рэспіраторнага этыкету і асабістай гігіены, і **галоўны санітарны ўрач Мінска Нэлі ГІНДЗЮК.**

— Апошнім часам назіраецца некаторая самазаспакоенасць мінчан у плане прафілактыкі рэспіраторных захворванняў і іншых інфекцый. Хоць яны па-ранейшаму актуальныя. Гэта датычыцца і рэспіраторных інфекцый, а з наступленнем спякоты — і вострых кішэчных. Таму толькі асноўныя правілы прафілактыкі дазволяць пазбегнуць іх распаўсюджання.

Сярод асноўных правілаў — захаванне рэспіраторнага этыкету, мыццё рук і апрацоўка паверхняў і гаджэтаў, якімі часта карыстаецеся цягам дня. Актуальным застаецца і сацыяльнае дыстанцыраванне.

— Прытрымлівацца адлегласці ў 1,5 метра адзін ад аднаго важна на рынках, у магазінах, на пляжах і іншых месцах. У месцах масавага збору людзей насіце маску, якую варта мяняць кожныя дзве гадзіны. Калі ў масцы няма патрэбы, яе варта зняць і пакласці ў пакет. Ні ў якім разе не трэба насіць яе на вуху ці падбародку — такім чынам вы спачатку інфіцыруеце маску, а потым і сябе, — адзначыла Нэлі Гіндзюк.

Наша краіна перасягнула мяжу ў 50 тысяч інфіцыраваных. Па даных Міністэрства аховы здароўя, на 9 чэрвеня зарэгістравана 50 265 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19. З іх паправілася і выпісана 24 506 пацыентаў, за ўвесь перыяд распаўсюджання хваробы памерла 282 чалавекі. За гэты час праведзена 644 160 тэстаў. Прырост за апошнія суткі склаў 812 новых выпадкаў, выпісана 626 пацыентаў, шасцярых выратаваць не ўдалося.

Алена КРАВЕЦ.